*Красулін, Я. А.* «Трыяда Паленке» як версія блізнечнага міфа / Я. А. Красулін // Лістападаўскія сустрэчы – 5. Праблемы старажытнасці і сярэднявечча: Зборнік артыкулаў па матэрыялах Міжнароднай навуковай канферэнцыі ў гонар акадэмікаў М. М. Нікольскага і У. М. Перцава (13–14 лістапада 2003 г., Мінск) / Навук. рэд. В. А. Фядосік і І. А. Еўтухоў. – Мн.: БДУ, 2005. – С. 29-33.

***Я. А. Красулін***

# «ТРЫЯДА ПАЛЕНКЕ» ЯК ВЕРСІЯ БЛІЗНЕЧНАГА МІФА

Пад тэрмінам «Трыяда Паленке» разумеюць трох персанажаў міфалагічнага характару, якія прыгадваюцца ў шэрагу іерагліфічных тэкстаў, знойдзеных у гэтым горадзе. У першую чаргу гэта так званыя «міфалагічныя пасажы» з тэкстаў панэлей Крыжа, Лісцвянога Крыжа і Сонца, у якіх гутарка ідзе аб нараджэнні гэтых багоў.

Першым аб магчымасці існавання ў іерагліфічных тэкстах імёнаў боствaў, у гонар якіх выразана тая ці іншая панэль, пачаў казаць на пачатку XX ст. Эдуард Сэлер. Ён таксама выказаў думку, што надпісы могуць змяшчаць іерогліфы, якія абазначаюць імя бoства, у гонар якога быў пабудаваны той ці іншы храм. Аднак



імёны багоў, якія ўваходзілі ў «Трыяду Паленке», упершыню былі ідэнтыфікаванымі ў надпісах значна пазней. Зрабіў гэта Хайнрых Берлін у артыкуле «Трыяда Паленке». Тым самым ён увёў у навуковы абарот і сам тэрмін, які выкарыстоўваецца ў літаратуры для пазначэння гэтага феномена. У тым жа артыкуле Х. Берлін даў боствам, якія складалі Трыяду, індывідуальныя пазначэнні — GI, GII і GIII. Берлін лічыў, што гэтыя бoствы з’яўляюцца міфічнымі продкамі кіраўнікоў Паленке.

У хуткім часе пасля гэтага Дэвід Келі ў сваёй працы «Нараджэнне багоў у Паленке» паказаў, што даты народзінаў гэтых персанажаў запісаны ў левай частцы панэлі Крыжа[1]. Ён зніто̆ўвае ўсіх траіх з боствамі пантэона майя.

У 1978 г. Флойд Лаўнзберы ў артыкуле «Некаторыя праблемы інтэрпрэтацыі міфалагічнай часткі іерагліфічнага тэксту храма Крыжа ў Паленке» да багоў Трыяды дадаў яшчэ двух персанажаў, якія, на яго думку, з’яўляліся іх бацькамі. Такім чынам, была выказана думка, што іерагліфічныя тэксты Паленке змяшчаюць звесткі не аб трох, а аб пяці персанажах. Яны належалі да двух пакаленняў (бацькі і дзеці). Усе яны нарадзіліся блізка ад нулявой даты 4 Ахаў 8 Кумху (пачатак бягучага вялікага цыкла) і лічыліся ў Паленке боскімі прапродкамі мясцовых кіраўнікоў.

Падчас працы з Трыядай даследчыкі выкарыстоўваюць разнастайныя крыніцы — ад іканаграфіі класічнага перыяду да этнаграфічных крыніц каланіяльнай эпохі. Звычайна даследчыкі абапіраюцца менавіта на выявы боствaў на помніках класічнай эпохі і ў рукапісах посткласічнага перыяду, а таксама на эпас майя-кічэ «Папаль-Вух».

Пры гэтым GI атаясамліваецца з Хун-Ахпу, а GIII — са Шбаланке (дзякуючы ягуарыным рысам аднаго і другога). GII выпадае з агульнай карціны, таму што ў Папаль-Вух асноўнымі актарамі з’яўляюцца двое блізнят, а не трое. У той жа час у тэкстах Паленке гутарка ідзе відавочна аб трох братах. Таму можна дапусціць, што версія, паданая ў Папаль-Вух, крыху адрозніваецца ад той, што існавала ў класічны перыяд. Па меншай меры ад той, якая існавала ў Паленке, паколькі, магчыма, версіі касмаганічнага міфа маглі, маючы агульны падмурак, разыходзіцца ў дэталях.

[1] *Berlin H.* The Palenque Triad // Journal de la Societe des Americanistes 52, Paris, 1963. P. 91-99. *Kelley D.* The Birth of the Gods at Palenque // Estudios de Cultura Maya, vol. 5, Mexico, 1965. P. 93-134.

30

Адна з такіх версій была запісана этнографамі ў сяленні Сан Антоніе ў Бялізе. Гэтая легенда мае назву «Легенда аб Сонцы, Месяцы і Венеры». Змест легенды шмат у чым паўтарае змест Паполь-Вух, аднак існуюць і адрозненні. Асноўная тэма легенды — не перамога над уладарамі падземнага свету і, як следства, над смерцю, а стварэнне нябесных свяціл і культурных раслін. Гутарка ў ёй ідзе аб трох братах — Шулабе, ці Нахоч ічэ («Вялікае Вока»), які быў старэйшым братам, Кіне, які быў сярэднім, і Т’упе — малодшым браце.

Яіс гаворыцца ў самым пачатку, папярэдняму сонцу было цяжка выконваць свае абавязкі, таму замест яго насіць «карону» прапанавалі аднаму з братоў. Як ні дзіўна, гэта быў не старэйшы брат (які некаторых месцах легенды паказаны праставатым хлопцам), а сярэдні. Тут трэба адзначыць, што і ў Паполь-Вух Хун-Ахпу дапускае некалькі промахаў, якія выпраўляе Шбаланке, дзякуючы сваёй знаходлівасці. Двум астатнім таксама адводзіцца роля нябесных свяціл. Праўда, тут у легендзе няма паслядоўнасці. Спачатку старэйшы брат павінен зрабіцца Венерай, а малодшы — «альбо Марсам, альбо Юпітэрам». Аднак потым мы даведваемся, што абодва браты зрабіліся дзвюма праявамі Венеры: адзін — Ранішняй зоркай, другі — Вечаровай.

Паміж легендай аб Сонцы, Месяцы і Венеры ў Паполь-Вух існуе шмат агульнага, што дазваляе ўдакладніць некаторыя цьмяныя моманты. У абодвух выпадках дзейнічаюць тры пакаленні. Браты, і ў Паполь-Вух, і ў Легендзе, жывуць у сваёй бабулі, якой адведзена досыць злавесная роля. У тэксце Паполь-Вух яна хоча забіць іх, калі яны былі яшчэ немаўлятамі, у Легендзе — забіць, каб адпомсціць за смерць каханка. Сярэдняе пакаленне (пакаленне «бацькоў») прадстаўлена па-рознаму. У тэксце Паполь-Вух у яго склад уваходзяць тры персанажы: браты-блізняты Хун-Хун-Ахпу і Вукуб-Хун-Ахпу, а таксама дзяўчына Шкік. Гэтаму пакаленню адводзіцца няшмат месца ў апавяданні. Варта пры гэтым адзначыць, што ў якасці бацькі выступае толькі адзін брат — Хун-Хун-Ахпу, у якога нараджаюцца дзве пары блізнят ад розных жанчын. У тэксце Легенды гэтае пакаленне практычна адсутнічае. Напачатку гаворыцца, што бацькі братоў памерлі, потым мы даведваемся, што маці Кіна нарадзіла яго па-за шлюбам (як і маці Хун-Ахпу і Шбаланке). У тэксце яна з’яўляецца толькі для таго, каб аддаць даніну эдыпаву комплексу.

31

Нарэшце, трэцяе, малодшае пакаленне, прадстаўлена ў Паполь-Вух двума братамі-блізнятамі Хун-Ахпу і Шбаланке, а таксама іх двума аднакроўнымі братамі — Хун-Бацам і Хун-Чоўэнам. Хун-Ахпу і Шбаланке з’яўляюцца галоўнымі героямі апавядання, уваскросшымі пасля таго, як былі прынесены ў ахвяру ў падземным свеце, і тым самым перамогшым уладароў Шыбальбы. Іх браты, Хун-Бац і Хун-Чоўэн, хоць і належаць да такога ж пакалення, але яны з’яўляюцца як бы падначаленымі самаму старэйшаму пакаленню. Яны, па загаду сваёй бабулі, робяць усё, каб пазбавіцца Хун-Ахпу і Шбаланке. За гэта яны пераўтвараюцца ў малпаў.

У тэксце Легенды малодшае пакаленне складаецца з трох братоў, асноўнымі актарамі з якіх з’яўляюцца сярэдні і старэйшы. Малодшы, як і Хун-Бац і Хун-Чоўэн з Паполь-Вух, спачувае старэйшаму пакаленню, не жадаючы ўдзельнічаць у забойстве сваёй бабулі. Як і Хун-Бац і Хун-Чоўэн, малодшы брат Шулаба і Кіна пераўтварыўся ў

малпу. Тут, як бачым, можна правесці паралель паміж Хун-Бацам і Хун-Чоўэнам, з аднаго боку, і Т'упам — з другога. Паміж імі і сапраўды існуе шмат агульнага, так што можна правесці паралелі паміж іх вобразамі ў двух разнастайных апавяданнях і сказаць, што, па сутнасці, у абодвух выпадках гутарка ідзе аб адным і тым жа. А калі ўлічыць, што імёны Хун-Бац і Хун-Чоўэн абазначаюць, па сутнасці, адно і тое ж — «малпа», дык іх можна трактаваць як аналаг Т'упа. Прасцей кажучы, яны з'яўляюцца для Хун-Ахпу і Шбаланке гэтакім жа «трэцім братам», як і Т'уп для Кіна і Шулаба. Магчыма, што выява дзвюх фігур немаўлят у храме Лісцвянога Крыжа, якая паставіла ў тупік Келі, чакаўшага ўбачыць іх, хутчэй, у храме Крыжа,[1] якраз і ёсць пацвярджэнне таго, што менавіта GII з'яўляецца «падвойным» персанажам. У некаторых варыянтах ён выступае як двойня, а ў некаторых — як адзінае цэлае.

Такім чынам, і ў Папаль-Вух, і ў Легендзе на ўзроўні пакалення галоўных герояў дзейнічаюць тройцы, як і ў тэкстах Паленке, што дазваляе правесці наступныя паралелі: Хун-Ахпу, Шбаланке — Кін, Шулаб — GI, GIII; Хун-Бац, Хун-Чоўэн — Т'уп — GII. На падмурку гэтых паралеляў можна будаваць гіпотэзы адносна функцый таго ці іншага боства Трыяды Паленке.

Што тычыцца трэціх братоў, дык яны сімвалізуюць сувязь праз пакаленне. Іканаграфія GII таксама дэманструе, што ён асацыіруецца

---

[1] *Kelley D.* Op. cit. P. 120.



з сувяззю з продкамі, на што ўказвае пупавіна. Выява знака T1030, пры дапамозе якога запісваецца імя GII, таксама змяшчае элемент, які можа з'яўляцца выявай пупавіны. Адначасова ён нагадвае і хвост малпы. Нажаль, імя GII высветліць не так проста. Можна толькі выказаць думку, што яно знітавана з малпай. На гэта ўказваюць, напрыклад, імёны Хун-Баца і Хун-Чоўэна. Імя Т'упа не мае такога значэння, яно перакладаецца літаральна як «малодшае дзіця». У тэксце Легенды, аднак, гаворыцца, што ён пераўтварыўся ў малпу. На мове майя гэтае слова гучыць як *maax*. Ямо таксама значыць «капрыз, прывярэдлівасць цяжарнай», «зааморфнае боства ці міфічны персанаж». Магчыма, менавіта гэтае фанетычнае значэнне можа мець знак T1030, які абазначае імя GII. Аднак для гэтага знака прапануюцца і іншыя чытанні. Магчыма, дакладнае значэнне імені GII дапамогуць высветліць далейшыя даследаванні.

З іншымі братамі крыху складаней — трэба яшчэ высветліць, хто каму адпавядае ў парах. Для гэтага вызначаюць агульныя рысы, па якіх можна ідэнтыфікаваць таго ці іншага персанажа. Першым такім крытэрыем можа быць старэйшынства. Аб значымасці такога крытэрыю сведчыць той факт, што ў двух выпадках на гэта ўвага звяртаецца адмыслова — у Легендзе падкрэсліваецца, што Кін быў сярэднім братам, а ў іерагліфічных тэкстах Паленке на гэта ўказваюць даты нараджэнняў. Такім чынам, для пар Шулаб-Кін і GI-GIII указана, хто з'яўляецца старэйшым — Шулаб і GI суадносна. Калі атаясамліваць персанажаў па ўзросту, дык атрымліваецца, што GI адпавядае Шулабу, а GIII — Кіну. Аднак, аднаго крытэрыю недастаткова. У якасці пацвярджэння гэтага можна выкарыстоўваць сувязь з нябеснымі свяцiламі таго ці іншага міфалагічнага персанажа. Шулаб, як вядома, павінен быў зрабіцца Венерай ці, па іншай версіі, Ранішняй зоркай. Кін зрабіўся новым сонцам. Такім чынам, GIII павінен сімвалізаваць сонца, а GI — Венеру.

Іканаграфія сведчыць, што GIII асацыіруецца з рознымі праявамі боскага ягуара, у тым ліку і ягуара-сонца. Імя GIII, таксама, у адным месцы запісана адным знакам — T1010, які чытаецца як *k'in* (храм Надпісаў, Цэнтральная панэль, E4). Акрамя таго, ён

знітаваны з храмам Сонца, цэнтральны элемент якога сімвалізуе гэтае свяціла. GI у той жа час знітаваны з Венерай праз даты яе бачнага руху па небасхілу. Такім чынам, боства G1 можа адпавядаць Шулабу, а GIII — Кіну.